# Арганізатар пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы і класны кіраўнік

В. ЧЭЧАТ,
аспірант Мінскага педінстытута імя А. М. Горкага

Арганізатары пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы (ў далейшым будзем пісаць проста «арганізатар» або «арганізатар выхаваўчай работы») многіх школ нашай рэспублікі дамагліся значных поспехаў. Яны ўніклі ў спецыфіку выхаваўчай дзейнасці класных кіраўнікоў, аб'ядналі іх творчыя намаганні ў галіне планавання, арганізацыі і правядзення мэтанакіраванай і змястоўнай выхаваўчай работы, з улікам магчымасцей і схільнасцей кожнага класнага кіраўніка, умела расставілі іх па розных участках пазаўрочнай дзейнасці, арганізавалі эфектыўную метадычную вучобу па пытаннях тэорыі і практыкі камуністычнага выхавання.

Звернемся да канкрэтных прыкладаў і пакажам, з чаго арганізатары пачалі работу з класнымі кіраўнікамі, як наладжвалі іх метадычную вучобу, якім чынам удасканальваюць формы і метады работы з імі ў сучасны момант.

Арганізатар сярэдняй школы № 6 г. Мінска Тамара Іосіфаўна Чобатава ўспамінае: «Пачынаючы працаваць на новай пасадзе, я перш за ўсё вывучыла стыль работы кожнага класнага кіраўніка...» Наведваючы ўрокі, піянерскія зборы, камсамольскія сходы, палітінфармацыі, дыспуты, канферэнцыі, Тамара Іосіфаўна не толькі рабіла крытычныя заўвагі і ўлічвала праведзеныя мерапрыемствы. Яна ўвесь час звяртала ўвагу на тое, як класны кіраўнік працуе з камсамольскай групай, як адносіцца да піянерскіх спраў у атрадзе, наколькі правільна ўмее арганізаваць работу настаўніцкага калектыву класа па павышэнні паспяховасці і дысцыпліны вучняў, па выяўленні іх запатрабаванняў, інтарэсаў, магчымасцей і здольнасцей.

Вывучыўшы вопыт класных кіраўнікоў, унікнуўшы ў іх педагагічнае крэда, выявіўшы схільнасці, інтарэсы і магчымасці, Тамара Іосіфаўна прыняла захады да таго, каб найбольш рацыянальна былі размеркаваны класы паміж настаўнікамі, каб апошнія знаходзіліся на тых участках выхаваўчай работы, на якіх яны знайшлі б сябе, працавалі з агеньчыкам, здолелі прынесці найбольшую карысць. І выніку атрымаліся ня дрэнныя. Вось ужо тры гады палітычныя клубы старшакласнікаў «Праметэй» і «Каментатары» (іх работай кіруюць настаўнікі гісторыі і грамадазнаўства Н. С. Алукер і Э. М. Сімкоўская) праводзяць змястоўную работу па ідэйна-палітычным выхаванні вучняў. «Праметэеўцы» рыхтуюць гутаркі, лекцыі і даклады на розныя тэмы, арганізуюць правядзенне тэматычных вечароў, тэарэтычных канферэнцый, вусных часопісаў, сустрэч з удзель-

нікамі Кастрычніка, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, з вучонымі, пісьменнікамі, лектарамі і г. д.

Добра працуюць юнакі і дзяўчаты, якія кожнае лета выязджаюць у лагер працы і адпачынку старшакласнікаў «Юнацтва». Начальнікам лагера з'яўляецца класны кіраўнік Н. Х. Касаткіна. Цікавыя дыспуты, тэарэтычныя канферэнцыі, вечары, абмеркаванне кніг і ўласных твораў праводзяцца ў літаратурным гуртку «Юныя таленты», якім кіруе Ф. В. Якаўлева. Калектыўную пошукавую дзейнасць вучняў па напрамках «Жыццё і дзейнасць Ф. Э. Дзяржынскага», «Героі-чэкісты — нашы землякі» ўзначальваюць Т. І. Чобатава і дырэктар школы В. І. Кабяк. У школе створан музей Ф. Э. Дзяржынскага; устаноўлен помнік палымянаму бальшавіку-чэкісту.

Тамара Іосіфаўна імкнецца да таго, каб класныя кіраўнікі прызначаліся задоўга да пачатку навучальнага года, і адразу ж накіроўвае іх намаганні на вывучэнне школьнікаў, іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей, на знаёмства з бацькамі. Такім чынам ідзе папярэдняя ўдумлівая падрыхтоўка да мэтанакіраванага і канкрэтнага планавання выхаваўчай работы з класам, у якім улічваецца ўзровень развіцця вучняў, ступень іх маральнай выхаванасці, інтарэсы, схільнасці і магчымасці. Арганізатар патрабуе, каб у плане кожны класны кіраўнік даваў падрабязную характарыстыку класа, вызначаў канкрэтныя мэты і задачы на вучэбную чвэрць, намячаў формы індывідуальнай работы з пэўнымі вучнямі. У далейшым, у планах на кожную чвэрць, характарыстыка не пішацца, а ва ўступе ўказваюцца канкрэтныя змены ў развіцці калектыву, фіксіруюцца вынікі праведзенай работы, канкрэтызуюцца задачы, ставяцца новыя.

Каштоўна тое, што планы выхаваўчай работы пішуцца ў адным агульным сшытку на працягу раду гадоў (раней яны захоўваліся 1 — 2 чвэрці). Гэта дае магчымасць арганізатару і класным кіраўнікам, асабліва пачынаючым, прасачыць дынаміку росту і развіцця класнага калектыву на працягу некалькіх гадоў, удумліва вывучыць усё лепшае, выявіць упушчэнні і прабелы, не паўтарацца ў рабоце. Апрача агульнашкольных планаў на год і на чвэрць, складаецца перспектыўны план, у якім вызначаны мэты і задачы школы на бліжэйшыя 2 — 3 гады. Усё гэта дапамагае класным кіраўнікам весці выхаваўчую работу мэтанакіравана, канкрэтна, з разлікам на будучыню.

Разумеючы, што эфектыўнасць выхаваўчай работы з вучнямі залежыць ад педагагічнага майстэрства класных кіраўнікоў, Тамара Іосіфаўна сумесна з дырэктарам школы планамерна і мэтанакіравана арганізуе іх метадычную вучобу. Заняткі семінараў класных кіраўнікоў па секцыях (1 — 4, 5 — 7, 8 — 10 класы) праходзяць 1 — 2 разы ў месяц у самых разнастайных формах. Гэта і даклады з вопыту работы лепшых класных кіраўнікоў, і творчыя справаздачы аб педагагічным даследаванні, якое праводзіцца па адной з праблем выхавання, і практыкумы, і распрацоўка рэкамендацый, і правядзенне аглядаў навінак педагагічнай і псіхалагічнай літаратуры, артыкулаў з педагагічных часопісаў і газет і інш.

На семінарах класных кіраўнікоў абмяркоўваюцца самыя актуальныя пытанні: павышэнне ролі класных кіраўнікоў у сувязі з ажыццяўленнем сярэдняй адукацыі, псіхалагічныя і ўзроставыя асаблівасці дзяцей і задачы выхавання, планаванне выхаваўчай работы. Асаблівая ўвага ўдзяляецца праблемам выхавання вучняў на прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна і Ф. Э. Дзяржынскага, удасканаленню форм ваенна-патрыятычнага выхавання, ідзе размова пра развіццё пазнавальных здольнасцей і інтарэсаў у дзяцей, падрыхтоўку вучняў да самастойнага жыцця і свядомага выбару прафесіі, палітычную асвету школьнікаў.

З вялікай карысцю для класных кіраўнікоў праходзяць заняткі семінараў па тэмах, звязаных з камсамольскай і піянерскай работай. На такіх занятках тав. Чобатава галоўную ўвагу ўдзяляе ўдасканаленню форм і метадаў педагагічнага кіраўніцтва дзейнасцю камсамольскіх груп і піянерскіх атрадаў. Вывучаюцца партыйныя дакументы, пастановы вышэйшых камсамольскіх органаў, чытаюцца тэарэтычныя даклады; класныя кіраўнікі дзеляцца вопытам работы з камсамольцамі і піянерамі.

Перад заняткамі семінараў па пытаннях камсамольскай і піянерскай работы арганізатар сама наведвае — і дамагаецца гэтага ад класных кіраўнікоў — камсамольскія сходы, пія-

нерскія зборы, тэарэтычныя канферэнцыі, пасяджэнні палітычных клубаў і г. д. Пасля кожнага такога наведвання Тамара Іосіфаўна абменьваецца думкамі з класнымі кіраўнікамі, тактоўна звяртае іх увагу на тое, як у педагагічнай літаратуры асветлены пытанні, кра якія ідзе гутарка, прыводзіць прыклады з вопыту розных класных кіраўнікоў школы.

Змястоўна і мэтанакіравана працуе метадычнае аб'яднанне класных кіраўнікоў сярэдняй школы № 16 г. Мінска (арганізатар Г. Н. Гаранiна). Работа секцыі плануцца на ўвесь навучальны год. Арганізатар, дырэктар, яго намеснікі па вучэбна-выхаваўчай рабоце перад складаннем плана работы аб'яднання асвятляюць кола тых пытанняў, якія больш за ўсё хвалююць класных кіраўнікоў, улічваюць парады, заўвагі, пажаданні апошніх.

Метадычная работа з настаўнікамі і класнымі кіраўнікамі праводзіцца па трох напрамках: выхаванне вучняў на прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа; выхаванне цікавасці да ведаў на ўроках і ў пазакласнай рабоце; выкарыстанне тэхнічных сродкаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе. Адпаведна гэтым напрамкам распрацоўваецца тэматыка заняткаў аб'яднання. Ставіцца задача, каб у змест работы кожнай секцыі і аб'яднання ў цэлым уваходзілі пытанні ідэйна-тэарэтычнай падрыхтоўкі класных кіраўнікоў, абагульненне і ўкараненне перадавога вопыту, абмеркаванні, сумесныя пошукі і, нарэшце, вывады і рэкамендацыі па прымяненні найбольш эфектыўных форм і метадаў выхаваўчай работы з вучнямі. Апрача чытання тэарэтычных дакладаў і абмену вопытам, на секцыях праводзяцца дыспуты як па асобных пытаннях педагогікі, так і па кнігах савецкіх пісьменнікаў і педагогаў.

Добрай традыцыяй стала ў школе правядзенне заключных заняткаў метадычнага аб'яднання ў форме навукова-практычных канферэнцый, школьных педагагічных чытанняў, ленінскіх чытанняў, на якіх прысутнічаюць класныя кіраўнікі, настаўнікі, выхавацелі. Так, на 4-х агульнашкольных ленінскіх чытаннях па тэме «Сістэма работы школы на прыкладзе жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа», прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння правадыра, было заслухана каля 20 дакладаў класных кіраўнікоў, настаўнікаў і выхавацеляў, якія ахапілі многія бакі разнастайнай дзейнасці школы па выхаванні вучняў.

З вялікай карысцю для педагагічнага калектыву прайшлі навуковапрактычныя канферэнцыі па эстэтычным выхаванні і выкарыстанні тэхнічных сродкаў у вучэбна-выхаваўчай рабоце школы. Настаўнікі і класныя кіраўнікі не толькі выкладалі тэарэтычныя палажэнні, але і імкнуліся як мага паўней раскрыць вопыт сваёй работы, зрабіць педагагічныя вывады.

У сярэдняй школе № 6 г. Слуцка Мінскай вобласці семінар класных кіраўнікоў працуе па агульнай тэме «Выхаванне, навучанне і развіццё вучняў — адзіны працэс». Распрацаван план самаадукацыі. Ён уключае праблемныя пытанні, над якімі працуе педагагічны калектыў. Кожны класны кіраўнік выбірае і распрацоўвае адну з тэм.

Арганізатар Н. І. Будзько імкнецца да таго, каб класныя кіраўнікі атрымалі канкрэтную метадычную і практычную дапамогу ў павышэнні свайго ідэйна-тэарэтычнага і прафесіянальнага ўзроўню. Таму работа семінара будуецца так, каб тэарэтычная частка заняткаў дапаўнялася практычнай і наадварот. Вось, напрыклад, як было арганізавана некалькі семінараў у такім плане.

Наведаўшы піянерскі збор у 6-м класе, класныя кіраўнікі затым праслухалі даклад піянерважатага на тэму «Класны кіраўнік і піянерскі атрад». Пасля наведвання тэматычнай палітінфармацыі ў 9-м класе і агляду маладзёжных часопісаў у 10-м класе настаўнік гісторыі зрабіў паведамленне аб формах і метадах палітычнай асветы вучняў. Даклад арганізатара на тэму «Класны кіраўнік і грамадская актыўнасць камсамольцаў» быў прачытаны пасля таго, як адна група класных кіраўнікоў прысутнічала на тэарэтычнай канферэнцыі ў 8-м класе па прамове У. І. Леніна на III з'ездзе РКСМ, а другая — на камсамольскім сходзе ў

10-м класе на тэму «Дастойную сустрэчу 50-гадоваму юбілею камсамола Беларусі».

Каб павысіць эфектыўнасць заняткаў семінара, арганізатар разам з дакладчыкамі выпрацоўвае пісьмовыя рэкамендацыі, складае спісы літаратуры па тэме, метадычныя парады і памяткі. Так, карыснымі для класных кіраўнікоў былі заняткі семінара па ленінскіх чытаннях. У дакладзе Н. І. Будзько «Аб формах і метадыцы правядзення ленінскіх чытанняў» даваліся каштоўныя парады, як лепш правесці чытанні з малодшымі школьнікамі, падлеткамі, старшакласнікамі, рэкамендавалася тэматыка, прыкладныя планы, пытанні, літаратура, падкрэслівалася думка аб магчымых шляхах сувязі чытанняў з жыццём вучняў, іх вучобай і грамадска карыснымі справамі. Затым класныя кіраўнікі наведалі ленінскія чытанні ў 7-м і 9-м класах. У 9-м класе яны праходзілі ў форме канферэнцыі «Юнацтва Леніна — прыклад для самавыхавання юнакоў і дзяўчат», а ў 7-м — пад дэвізам «Кожны павінен з усіх сіл раўняцца па Ільічу» (А. В. Луначарскі).

Для аказання аператыўнай метадычнай і практычнай дапамогі класным кіраўнікам арганізатары практыкуюць нарады (пры арганізатары або дырэктары школы з удзелам арганізатара, намесніка дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце), сістэматычныя групавыя і індывідуальныя кансультацыі, перш за ўсё па планаванні. У час гэтых кансультацый арганізатары арыентуюць класных кіраўнікоў на ўлік узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў, спецыфікі работы школы, яе традыцый. Праводзяцца таксама кансультацыі па арганізацыі і правядзенні пазаўрочных выхаваўчых мерапрыемстваў (дыспутаў і дыскусій, палітінфармацый і дакладаў, тэарэтычных канферэнцый, мітынгаў, вечароў, прысвечаных знамянальным датам нашай краіны і рэспублікі і г. д.) і па пытаннях педагагічнага кіраўніцтва дзейнасцю вучнёўскіх грамадскіх арганізацый, органаў дзіцячага самакіравання.

Як паказвае практыка, у павышэнні прафесіянальнага майстэрства класных кіраўнікоў вялікую дапамогу аказваюць метадычныя пакоі і куткі, якія ствараюць арганізатары. Так, у метадычным кутку сярэдняй школы № 6 г. Мінска класныя кіраўнікі могуць знайсці літаратуру па педагогіцы і псіхалогіі, часопісы, праграму «Арыенцір», «Прыкладную праграму выхавання вучняў 8-гадовай і сярэдняй школы». Ёсць тут рэкамендацыі па правядзенні палітінфармацый, матэрыялы распрацаваных і праведзеных у школе гутарак, дыспутаў, тэарэтычных канферэнцый, камсамольскіх сходаў, піянерскіх і акцябрацкіх збораў, даклады, прачытаныя на школьных педагагічных чытаннях і навукова-практычных канферэнцыях.

Багатую педагагічную літаратуру і метадычныя распрацоўкі мае метадычны кабінет сярэдняй школы № 16 г. Мінска. У ім сабраны не толькі педагагічныя кнігі, брашуры, часопісы, але і распрацоўкі рэспубліканскага і гарадскога інстытутаў удасканалення настаўнікаў, Палаца піянераў і школьнікаў, метадычныя ўказанні гарадскога аддзела народнай асветы, матэрыялы школьных педагагічных чытанняў і навукова-практычных канферэнцый. Больш за 300 метадычных распрацовак, створаных намаганнямі ўсяго педагагічнага калектыву, з'яўляюцца добрай базай для арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы. Афармлен аддзел «У дапамогу класнаму кіраўніку», складзена картатэка па школьных ленінскім і краязнаўчым музеях, афармлены выстаўкі-стэнды «У дапамогу настаўніку», «Работа з бацькамі», «Метадычная работа і планаванне», «Планаванне выхаваўчай работы ў школе», на якіх змешчаны планы работы школьных музеяў, камсамольскай і піянерскай арганізацый, метадычнага аб'яднання класных кіраўнікоў, клубаў, гурткоў, лекторыя.

Арганізатары некаторых школ выдаюць рукапісныя метадычныя зборнікі або часопісы «У дапамогу класнаму кіраўніку», «З вопыту выхаваўчай работы», «Работа класнага кіраўніка» (перыядычнасць 2 — 3 нумары ў год), у якіх змяшчаюцца прыкладныя планы выхаваўчай работы класных кіраўнікоў, апісанні камсамольскіх сходаў, піянерскіх і акцябрацкіх збораў, сцэнарыі тэматычных вечароў і ранішнікаў, матэрыялы тэарэтычных канферэнцый, дыспутаў, школьных педагагічных чытанняў і г. д.

Хацелася б спыніцца і на цяжкасцях, якія сустракаюцца ў рабоце арганізатара з класнымі кіраўнікамі. У анкетах, інтэрв'ю і гутарках, праведзеных намі з 240 арганізатарамі школ рэспублікі, 167 вызначылі як «самы цяжкі ўчастак» сваёй дзейнасці «работу з класнымі кіраўнікамі», у прыватнасці, арганізацыю і правядзенне метадычнай вучобы з імі.

У чым жа бачаць арганізатары прычыны цяжкасці? Перш за ўсё «ў адсутнасці вопыту і пэўных педагагічных навыкаў», затым «у недастатковым імкненні асобных класных кіраўнікоў да павышэння свайго прафесіянальнага майстэрства», «у нежаданні раду класных кіраўнікоў прыслухоўвацца да метадычных парад і рэкамендацый», «у адсутнасці неабходнай педагагічнай і метадычнай літаратуры ў школе», «у празмернай загружанасці бягучымі справамі», «у адсутнасці цвёрда ўстаноўленага дня вучобы класных кіраўнікоў». Некаторая частка арганізатараў бачыць цяжкасці «ў недастатковай увазе і дапамозе з боку дырэктара школы», «у нежаданні намесніка дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ў садружнасці і кантакце займацца пытаннямі павышэння выхаваўчага майстэрства класных кіраўнікоў і настаўнікаў» і інш.

Асабліва трэба падкрэсліць той факт, што ў адказах амаль усіх арганізатараў была скарга на «адсутнасць неабходнай педагагічнай і метадычнай літаратуры па пытаннях выхаваўчай работы ў школе», выказана пажаданне мець яе. Такое імкненне арганізатараў зусім апраўдана і заслугоўвае ўвагі. Пастаянная работа з педагагічнай і метадычнай літаратурай, якая, паводле трапнай заўвагі вялікага рускага педагога К. Д. Ушынскага, знаёміць нас з псіхалагічнымі нагляданнямі мноства разумных і вопытных педагогаў і, галоўнае, накіроўвае нашу ўласную думку на такія прадметы, якія маглі б аказацца па-за нашай увагай, мае велізарнае значэнне для ўдасканалення педагагічнага майстэрства кожнага настаўніка, класнага кіраўніка, выхавацеля.

Шматгранныя і складаныя функцыі арганізатара ў рабоце з класнымі кіраўнікамі. Для таго, каб вучыць майстэрству выхоўваць іншых, трэба няспынна вучыцца самому, быць высокаадукаваным і эрудзіраваным чалавекам, добра ведаць дасягненні педагагічнай навукі і перадавой школьнай практыкі. Пытанням метадычнай вучобы і павышэння ідэйна-прафесіянальнага майстэрства арганізатараў школ рэспублікі пастаянную ўвагу ўдзяляюць інстытуты ўдасканалення настаўнікаў, аддзелы народнай асветы і іх педагагічныя кабінеты, але галоўнае тут залежыць перш за ўсё ад іх саміх. Яны не павінны чакаць, пакуль хтосьці за іх арганізуе вучобу класных кіраўнікоў. Маючы агульны напрамак, кожны арганізатар павінен няспынна і сістэматычна працаваць над сабой, будаваць работу з класнымі кіраўнікамі з улікам спецыфічных асаблівасцей сваёй школы, засвойваць усё каштоўнае, што ёсць у педагагічнай скарбонцы вопытных класных кіраўнікоў і настаўнікаў, вучыцца ў іх з тым, каб пастаянна вучыць іншых майстэрству выхавання.

У заключэнне зробім некаторыя агульныя вывады. Для дасягнення мэтанакіраванай і эфектыўнай работы з класнымі кіраўнікамі арганізатару пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы важна:

— працаваць у цеснай садружнасці з дырэктарам школы і намеснікам яго па вучэбна-выхаваўчай рабоце;

— прыцягваць да выхаваўчай дзейнасці ўвесь калектыў класных кіраўнікоў з улікам іх магчымасцей і здольнасцей, выкарыстоўваючы як групавыя, так і індывідуальныя формы і метады работы з імі;

— галоўную ўвагу накіроўваць на вывучэнне, абагульненне, навуковае абгрунтаванне і распаўсюджванне перадавога педагагічнага вопыту;

— арганізуючы вучобу класных кіраўнікоў, выносіць на семінары галоўныя пытанні выхаваўчай работы, якія вызначаюць змест дзейнасці педагагічных калектываў рэспублікі і краіны;

— разам з класнымі кіраўнікамі шукаць шляхі найбольш правільнага практычнага прымянення разнастайных форм і метадаў выхаваўчай работы, імкнуцца да ўдасканалення іх у дастасаванні да новых умоў і патрабаванняў часу.

■